В.Ю. Ігнаценка,
начальнік аддзела падтрымкі і развіцця культурна-адукацыйных ініцыятыў
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

В.Т. Масалава,
намеснік начальніка аддзела падтрымкі і развіцця культурна-адукацыйных ініцыятыў
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Падтрымка таленавітай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь: аналіз дасягненняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (далей — спецыяльны фонд) выконвае важную ролю папулярызацыі творчасці маладых, актыўных, адораных грамадзян дзяржавы.

За гады сваёй дзейнасці спецыяльны фонд стаў адной з найбольш аўтарытэтных арганізацый краіны ў агульнадзяржаўнай справе творчага развіцця таленавітых маладых грамадзян.

Сістэма падтрымкі, аналаг якой цяжка знайсці ў свеце, пачала распрацоўвацца з моманту падпісання Прэзідэнтам Указа ад 20 лістапада 1995 г. № 473 «Аб падтрымцы таленавітай моладзі Рэспублікі Беларусь». Па ініцыятыве Кіраўніка дзяржавы названы дакумент прадугледжваў стварэнне спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, які адразу стаў важным звяном у сістэме работы з юнымі талентамі,ператварыўшыся ў наглядны прыклад рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы таленавітай моладзі і нацыянальнай культуры. Да выканання сваёй непасрэднай мэты — фарміравання неабходных умоў для пошуку, станаўлення і творчага развіцця маладога пакалення — фонд прыступіў 1 студзеня 1996 г.

У 2008 г. распрацавана Палажэнне аб прысуджэнні заахвочванняў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (далей — Палажэнне аб заахвочванні), зацверджанае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лютага 2008 г. № 142, адпаведна якому савет спецыяльнага фонду прымае рашэнні аб выдзяленні сродкаў на выплату таленавітым навучэнцам, студэнтам, педагогам, маладым дзеячам культуры і мастацтва за творчыя дасягненні стыпендый, прэмій і матэрыяльнай дапамогі, аплату стажыровак, а таксама грантаў на ажыццяўленне творчых праектаў.

Экспертна-мастацкая камісія спецыяльнага фонду ацэньвае творчыя дасягненні саіскальнікаў па хадайніцтвах аб заахвочванні пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх мастацка-творчых спаборніцтваў (уладальнікаў Гран-пры, І, ІІ, ІІІ месцаў), прадстаўленых установамі адукацыі ў сферы культуры, арганізацыямі, грамадскімі аб’яднаннямі і інш. Суправаджэнне работы камісіі ажыццяўляе Інбелкульт.

Да пераможцаў мастацка-творчых спаборніцтваў прад'яўляюцца наступныя патрабаванні: добрая паспяховасць і выдатныя паводзіны навучэнцаў; высокія паказчыкі ў навуковай і педагагічнай дзейнасці маладых дзеячаў культуры. Улічваюцца творчыя дасягненні саіскальнікаў на працягу двух гадоў, што папярэднічаюць вылучэнню на заахвочванне, удзел у грамадскім жыцці.

За 20 гадоў дзейнасці фонду званне лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду атрымалі 3521 чалавек і 236 калектываў, матэрыяльная дапамога аказана 775 грамадзянам, падтрыманы 375 грантаў.

Вышэйшая ўзнагарода спецыяльнага фонду — Гранд-прэмія — прысуджаецца за перамогу ў найбольш прэстыжных міжнародных конкурсах, сярод якіх Міжнародны конкурс выканаўцаў на струнных смычковых інструментах імя М. Ельскага, Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск», Міжнародны конкурс маладых поп-выканаўцаў «Детская Новая Волна», Міжнародны конкурс піяністаў «Мінск», Міжнародны тэлевізійны конкурс юных музыкаў «Щелкунчик», Міжнародны конкурс оперных спевакоў «Санкт-Петербург» і інш.

Большасць лаўрэатаў спецыяльнага фонду не спыняюцца на дасягнутым: выбіраюць творчасць сваёй прафесіяй, становяцца педагогамі і перадаюць майстэрства іншым.

Знакаміты баяніст Уладзіслаў Плігаўка 11 разоў заахвочаны спецыяльным фондам. Ён заваяваў перамогу на міжнародных конкурсах у Германіі, Вялікабрытаніі, Італіі, Францыі, Аўстраліі. Сёння ён таленавіты педагог, член журы шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.

Скрыпач-віртуоз Алег Яцына стаў адным з першых стыпендыятаў спецыяльнага фонду, вядзе актыўную творчую дзейнасць як у Беларусі, так і за яе межамі, з'яўляецца лаўрэатам шматлікіх міжнародных конкурсаў у Чэхіі, Францыі, Фінляндыі, Ізраілі, Вялікабрытаніі, Злучаных Штатах Амерыкі.

Аксана Волкава — лаўрэат спецыяльнага фонду, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, за асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і мастацтва ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны. Спявачка захапляе гледачоў унікальным голасам, выступае на прэстыжных канцэртных пляцоўках Францыі, Вялікабрытаніі, Ірландыі, Італіі, Іспаніі.

Вольга Мельнік-Малахава — паспяховы жывапісец, работы якой можна сустрэць у музеях і прыватных калекцыях, актыўны ўдзельнік міжнародных і рэспубліканскіх выставачных праектаў, тройчы ўзнагароджана спецыяльным фондам. Сярод яе студэнтаў таксама ёсць лаўрэаты спецыяльнага фонду.

Адзін з самых маладых, але ўжо знакамітых лаўрэатаў — Уладзіслаў Хандогі, пераможца міжнародных конкурсаў і фестываляў класічнай музыкі, уладальнік залатога медаля і прыза глядацкіх сімпатый 15-га Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Щелкунчик». Уладзіслаў стаў лепшым сярод 48 удзельнікаў з усяго свету.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эфектыўнасць дзейнасці спецыяльнага фонду пастаянна павышаецца, узмацняецца ўвага грамадства, творчай інтэлігенцыі да тых, хто атрымаў заахвочванне.

На працягу двух дзясяткаў гадоў лаўрэаты дэманструюць шырокай публіцы сваё майстэрства і талент на штогадовых справаздачных мерапрыемствах спецыяльнага фонду, суправаджэнне якіх ажыццяўляе Інбелкульт.

У 2015 г. адбыўся юбілейны канцэрт, прысвечаны 20-годдзю спецыяльнага фонду ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь, на якім выступілі лаўрэаты, якія былі адзначаны фондам з 1996 г. па 2015 г.

Удзельнікі канцэрта — прадстаўнікі новага пакалення беларускіх выканаўцаў: фартэпіянны дуэт Анастасіі і Дар'і Лукашэнка, Уладзіслаў Хандогі і інш.; прызнаныя зоркі беларускай оперы і балета: Таццяна Гаўрылава, Уладзімір Громаў, Канстанцін Геронік, Кацярына Алейнік, Андрэй Кавалінскі. Выступленні артыстаў суправаджалі: сімфанічны аркестр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь і сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам дырыжора Андрэя Іванова.

Працягам юбілейных культурных падзей стала Рэспубліканская мастацкая выстаўка лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, на якой экспанаваліся работы маладых беларускіх мастакоў: Алесі Скарабагатай, Вольгі Мельнік-Малахавай, Рамана Сустава, Ганны Кананавай, Аляксандра Даманава, Арцёма Мядзведзева, а таксама скульптара, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, аўтара манумента «Брама памяці» ў Трасцянцы Канстанціна Касцючэнкі.

Пры падтрымцы Міністэрства культуры і спецыяльнага фонду Інбелкультам праводзяцца міжнародныя і рэспубліканскія конкурсы, ажыццяўляюцца культурныя праекты, накіраваныя на павышэнне ўзроўню прафесійнага майстэрства навучэнцаў і педагогаў. Да ўдзелу ў мерапрыемствах запрашаюцца педагогі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры, якія засвойваюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі ў Інбелкульце.

Настаўнікі дзіцячых школ мастацтваў па класах духавых і ўдарных інструментаў, струнных смычковых інструментаў, фартэпіяна з Гродна, Ліды і Маладзечна, а таксама выкладчыкі ўстаноў сярэдняй адукацыі па малюнку, жывапісу, кампазіцыі з Мінска і Гомеля на працягу трох апошніх гадоў мелі магчымасць са сваімі вучнямі прыняць удзел у майстар-класах для навучэнцаў мастацкіх навучальных устаноў Беларусі і Расіі пад дэвізам «Саюзная дзяржава — маладым талентам XXI стагоддзя» на базе Цэнтральнай музычнай школы пры Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П.І. Чайкоўскага.

Адным з напрамкаў работы Інбелкульта з'яўляецца работа з педагогамі, якія выхоўваюць таленавітую моладзь: ладзяцца мастацкія выстаўкі работ навучэнцаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзіцячых школ мастацтваў і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, праводзяцца круглыя сталы са слухачамі, якія засойваюць праграмы павышэння кваліфікацыі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Мэта мерапрыемстваў — абмеркаванне актуальных пытанняў выхавання і развіцця творчых здольнасцей таленавітай моладзі, падрыхтоўкі вучняў да ўдзелу ў творчых конкурсах.

У працэсе навучання слухачы выкарыстоўваюць прэзентацыі, матэрыялы, якія змяшчаюць структураваную інфармацыю аб міжнародных і рэспубліканскіх творчых спаборніцтвах, метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы дакументаў на атрыманне грантаў спецыяльнага фонду і інш.

Адным з напрамкаў работы Інбелкульта з'яўляецца работа з педагогамі, якія выхоўваюць таленавітую моладзь: ладзяцца мастацкія выстаўкі работ навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў і ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У рамках адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі «Выяўленчае мастацтва: сучасныя методыкі выкладання» (для настаўнікаў дзіцячых школ мастацтваў, выкладчыкаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па малюнку, жывапісу, кампазіцыі); «Перспектывы развіцця ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры на сучасным этапе» (для дырэктараў дзіцячых школ мастацтваў); «Мастацка-адукацыйная дзейнасць: арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу» (для намеснікаў дырэктараў дзіцячых школ мастацтваў); «Сацыяльна-культурнае праектаванне і асаблівасці фарміравання рэгіянальнай палітыкі ў сферы культуры» (для начальнікаў, намеснікаў начальнікаў (загадчыкаў сектараў) упраўленняў, аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі) праводзяцца круглыя сталы па наступных тэмах: «Рэспубліканскія мастацкія выставы лаўрэатаў спецыяльнага фонду як прыклад дзяржаўнай падтрымкі таленавітай моладзі»; «Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры»; «Дзяржава і культура: стратэгія падтрымкі і развіцця»; «Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі».

На працягу апошніх гадоў праведзены рэспубліканскія тэматычныя мерапрыемствы з удзелам таленавітай моладзі і выкладчыкаў устаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі па тэмах:

«Актуальныя пытанні падтрымкі і развіцця культурна-адукацыйных працэсаў» (2011 г.);

«Мастацкая адукацыя ў галіне выяўленчага мастацтва і дызайну. Метады рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы» (2012 г.);

«Прафесійная музычная адукацыя. Метады рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы» (2013 г.);

«Прафесійная харэаграфічная адукацыя. Метады рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы» (2014 г.);

Галоўная мэта вышэйназваных мерапрыемстваў — абмеркаванне актуальных пытанняў выхавання і развіцця творчых здольнасцей таленавітай моладзі, падрыхтоўкі вучняў да ўдзелу ў конкурсах. Слухачам прапануюцца прэзентацыі, матэрыялы, якія змяшчаюць структураваную інфармацыю аб міжнародных і рэспублі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канскіх творчых спаборніцтвах, метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы дакументаў на атрыманне грантаў спецыяльнага фонду, публікацыі СМІ аб яго мерапрыемствах [1; 2].

З 2009 па 2013 гг. выдадзены каталогі «Майстар-класы. Саюзная дзяржава — маладым талентам XXI стагоддзя», у якія ўвайшлі фота- і тэкставыя матэрыялы па выніках правядзення майстар-класаў [3].

У 2016 г. падрыхтавана інфармацыйнае выданне «Таленты Беларусі» на беларускай, рускай і англійскай мовай, прысвечанае 20-годдзю дзейнасці спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі [4].

Немалаважным аспектам з'яўляюцца пытанні абмеркавання крытэрыяў, якія прадугледжаны Палажэннем аб заахвочванні. Для найбольш поўнага разумення педагогамі ўмоў Палажэння прыводзяцца наглядныя прыклады творчых спаборніцтваў.

Слухачам прапануецца інфармацыя аб дзейнасці спецыяльнага фонду, дэманструюцца лепшыя прыклады і ўзоры з мэтай павышэння прафесійнага ўзроўню педагогаў, падтрымкі іх сістэмнай работы па выхаванню таленавітай моладзі.

.Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Гаркоўская, В.* Ім адкрыты ўсе дарогі / В. Гаркоўская // Голас Радзімы. — Мінск, 2015. — № 46. — 10 снеж.
2. *Гаркоўская, В.* Твар сучаснага беларускага мастацтва / В. Гаркоўская // Голас Радзімы. — Мінск, 2016. — № 4. — 4 лют.
3. Мастер-классы. Союзное государство — молодым талантам XXI века / сост. В.Ю. Игнатенко. — Мінск : ГУО «Институт культуры Беларуси», 2009. — 72 с.
4. Таленты Беларусі : творчыя работы лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі [прысвячаецца 20-годдзю дзейнасці спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі] / адк. за выпуск В.Т. Масалава. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2016. — 104 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ